2. *Кульбекова, А. К.* Теоретические основы хореографического искусства и хореографического образования / А. К. Кульбекова // Science and world. – 2014. – № 1. – С. 298–300.

3. *Никитин, В. Ю.* Профессия – балетмейстер / В. Ю. Никитин // Культура и образование. – 2013. – № 2–4. – С. 56–68.

4. *Филановская, Т. А.* Структура компетентностной модели будущего педагога-хореографа / Т. А. Филановская // Высшее образование в России. – 2010. – № 11. – С. 144–149.

**А. Р. Зязюля,**
*дацэнт кафедры*
*інфармацыйных тэхналогій у культуры*

# КАМПЕТЭНТНАСНЫ ПАДЫХОД У АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «АДМІНІСТРАВАННЕ КАРПАРАТЫЎНЫХ СЕТАК»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змест дысцыпліны «Адміністраванне карпаратыўных сетак» прадугледжвае не толькі атрыманне ведаў у галіне тэхнічнай і праграмнай падтрымкі планавання, разгортвання, настройкі і кіравання складанымі тэхнічнымі сістэмамі і абсталяваннем, але і забеспячэнне надзейнага, эфектыўнага і бяспечнага ўзаемадзеяння значнай колькасці карыстальнікаў у сеткавым асяроддзі. Адразу адзначым, што вырашэнне пытанняў, звязаных з узаемадзеяннем карыстальнікаў у сеткавым асяроддзі, у многім залежыць ад кампетэнцый адміністратара.

Адміністраванне прадугледжвае карэктнае кіраванне аўтарызацыяй і доступам карыстальнікаў, якое ўключае назначэнне пэўных абмежаванняў і забеспячэнне неабходных праў і прыярытэтаў.

Адпаведныя кампетэнцыі могуць быць рэалізаваны пры выхаванні ў студэнтаў добразычлівых, карэктных і граматных адносін да карыстальнікаў. Гэтыя якасці фарміруюцца з пэўнай прафесійнай культурай і сістэмай маральных норм спецыяліста-адміністратара камп’ютарных сетак. Інакш кажучы, так фарміруюцца матывацыйны, этычны, сацыяльны і паводзінавы элементы кампетэнтнасці.

Праграма дысцыпліны прадугледжвае вывучэнне асноў арганізацыі ўзаемадзеяння ў сеткавым асяроддзі і яго асаблівасцей, праектавання тапалогій і забеспячэнне надзейнай, ап-

тымальнай і эфектыўнай работы сетак, а таксама выбару стратэгіі кіравання сеткавым узаемадзеяннем [1].

Безумоўна, найбольш эфектыўна работа будзе арганізавана толькі ў выпадку высокага ўзроўню кампетэнцый адміністратара, так як на практыцы ўсе ўказаныя стратэгіі ніколі не рэалізуюцца ў чыстым выглядзе. Рэальная работа заснавана на выкарыстанні змешанай стратэгіі.

Важнае месца ў падрыхтоўцы адміністратара займае дзейнасць па абароне сеткавай інфармацыйнай інфраструктуры ад несанкцыянаваных пранікненняў і выяўленне дзеянняў па падрыхтоўцы атак.

Мы разгледзелі толькі асноўныя напрамкі фарміравання канкрэтных прафесійных кампетэнцый у студэнтаў пры вывучэнні згаданай вучэбнай дысцыпліны. Пры гэтым трэба адзначыць, што, па-першае, фарміраванне кампетэнцый у студэнтаў звязана з неабходнасцю глыбокага шматбаковага аналізу практычна ўсіх выкладаемых пытанняў.

Па-другое, змест дысцыпліны павінен адпавядаць сістэме кампетэнцый, неабходных для фарміравання кампетэнтнага спецыяліста, якая ўключае прафесійныя, скразныя і ключавыя кампетэнцыі.

Па-трэцяе, фарміраванне комплексу кампетэнцый павінна адпавядаць прынцыпу несупярэчлівасці. Інакш кажучы, фарміраванне кампетэнцый павінна быць унутрана ўзгодненым.

Па-чацвёртае, комплекс кампетэнцый павінен быць дастаткова поўным і абгрунтаваным для фарміравання кампетэнтнага спецыяліста.

Можна падоўжыць спіс патрабаванняў да фарміравання зместу і выкарыстання тэхналогій кампетэнтнаснага падыходу, але іх рэалізацыя звязана з неабходнасцю ўвядзення крытэрыяльнага апарату. Тым не менш, канкрэтызуючы пералік кампетэнцый, якія плануюцца ў адукацыйным працэсе па дысцыпліне «Адміністраванне карпаратыўных сетак», можна адзначыць наступныя.

*Прафесійныя кампетэнцыі*: веданне прынцыпаў арганізацыі і праектавання камп’ютарных сетак, знаёмства з асноўнымі правіламі іх выкарыстання, валоданне навыкамі разгортвання і суправаджэння сеткавай работы, работы з сеткавым абсталяваннем, уменне выконваць наладку сеткавага абсталявання і адпаведнага праграмнага забеспячэння для канкрэтных рэжы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маў работы, валоданне неабходнымі навыкамі для разгортвання лакальных сетак ва ўстановах культуры і прадпрыемствах сярэдняга класа (50–100 супрацоўнікаў).

*Сацыяльна-камунікатыўныя кампетэнцыі:* уменне арганізаваць работу ў сеткавым рэжыме розных груп карыстальнікаў, узаемадзейнічаць з асобнымі карыстальнікамі і кіраўніцтвам, валоданне метадалогіяй і тэхналогіямі арганізацыі бяспечнай работы ў розных сегментах сетак.

*Ключавыя кампетэнцыі:* уменне атрымліваць новыя веды і выкарыстоўваць базавыя веды ў новых сітуацыях, здольнасць да атрымання новых ведаў і нетрывіяльнага вырашэння практычных задач, здольнасць да самастойнага выхавання асобасных якасцей (мэтанакіраванасці, здольнасці да аналітычнай дзейнасці, асабовай і кар'ернай матывацыі і інш.).

Канкрэтныя пытанні, якія спрыяюць фарміраванню азначаных кампетэнцый, указваюцца ў вучэбнай праграме па дысцыпліне.

Далейшае ўдасканаленне кампетэнтнаснага падыходу цесна звязана з далейшай фармалізацыяй аперацый, метадаў, сродкаў і тэхналогій і павінна адпавядаць прынцыпам мэтанакіраванасці, сістэмнасці, комплекснасці і інш. Тым не менш кампетэнтнасны падыход абазначыў новы крок у фармалізацыі адукацыйнага працэсу, значыць, пераход на новы ўзровень удасканальвання навукова-творчага падыходу.

---

1. *Зезюля, А. Г.* Администрирование корпоративных сетей : учеб. программа учреждения высш. обр. по учеб. дисциплине для специальности 1-21 04 01 Культурология (по направлениям), направления специальности 1-21 04 01-02 Культурология (прикладная), специализации 1-21 04 01-02 04 Информационные системы в культуре / А. Г. Зезюля. – Минск : БГУКИ, 2009. – 15 с.

2. Компетентностный подход в образовательном процессе : моногр. / А. Э. Федоров [и др.]. – Омск : Омскбланкиздат, 2012. – 210 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ